ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел бібліятэказнаўства

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

МАЙ – ЧЭРВЕНЬ

Віцебск 2016

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Май–чэрвень

Інфармацыйнае паведамленне

Складальнік **Васілеўская** Алена Мікалаеўна

Адказны за выпуск Т. М. Адамян

Камп'ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна"

210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а

E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by

УДК 008

ДУ "ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА"

Аддзел бібліятэказнаўства

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Май–чэрвень

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК

2016

ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Рэдактар *Н. А. Пугачова*
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : май–чэрвень : інфармацыйнае паведамленне / ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна”, Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. – Віцебск, 2016. – 36 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна”, 2016

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатрам імя Якуба Коласа і трыма расійскімі калектывамі Сергіева-Пасадскім драматычным тэатрам-студыяй “Тэатральны каўчэг”, Бранскім абласным тэатрам драмы імя А. К. Талстога і Санкт-Пецярбургскім – “За чорнай рэчкай” падпісана ў рамках III Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі (г. Нясвіж), у рабоце якога прыняў дырэктар Коласаўскага тэатра *А. Старых*. У сумесных планах – правядзенне гастроляў і абмен рэжысёрска-пастановачнымі трупамі для стварэння новых спектакляў.

http://kolastheatre.by/ru/news/kolasovskiy-teatr-podpisal-soglasheniya-s-rossiyskimi-teatrami

5 чэрвеня ў рамках конкурснай праграмы VI Міжнароднага фестывалю камерных і монаспектакляў “LUDI” на сцэне Арлоўскага дзяржаўнага тэатра для дзяцей і моладзі “Свободное пространство” прайшоў паказ спектакля “Похороните меня за плинтусом” па аднайменнай аповесці П. Санаева, рэжысёр-пастаноўшчык – заслужаны дзеяч мастацтва Рэспублікі Беларусь *В. Анісенка*. Выканаўца галоўнай ролі Бабулі заслужаная артыстка Беларусі *Тамара Скварцова* атрымала дыплом фестывалю ў намінацыі “Лепшая жаночая роля”, вядучы майстар сцэны *Пётр Ламан* адзначаны ў катэгорыі “Лепшая мужчынская роля другога плана”. Узнагароджаны таксама мастак-пастаноўшчык спектакля *Андрэй Жыгур* і артыст *Раман Салаўёў*, які сыграў хлопчыка Сашу Савельева.

Кіш, адзінай беларускай мастачкі, чыё імя ўвайшло ў сусветную энцыклапедыю наіўнага мастацтва. У экспазіцыі выставак былі прадстаўлены работы больш за 60 аўтараў з Віцебскай, Магілёўскай, Брэсцкай, Гродзенскай абласцей Беларусі, а таксама з гарадоў Масква, Санкт-Пецярбург, Каралёў, Анапа, Самара і інш. Калекцыю работ прадставіла галерэя "Арт-наив" (г. Масква).

Віцебскі АМЦНТ

У Культурна-гістарычным комплексе "Залатое кальцо горада Віцебска "Дзвіна" ў рамках святкавання Дня горада прайшоў фестываль майстроў-рамеснікаў "Таямніцы майстэрства", на якім былі прадстаўлены вырабы ў тэхніцы батыка, валяння, коўкі, фларыстыкі, адбыўся "Парад вышыванак".

КІНАМАСТАЦТВА

Кінатэатр "Мир" запрашаў гледачоў на рэтрансляцыі музычных тэатральных пастановак буйнейшых пляцовак свету – Metropolitan Opera (New York City), Вялікага тэатра (г. Масква), буйнейшых брытанскіх драматычных тэатраў – у фармаце кінатэатральнай праекцыі. Праект "TheatreHD" упершыню адкрыўся ў Віцебску **15 чэрвеня** рэтрансляцыяй з тэатра Каралеўскай Шэкспіраўскай кампаніі грандыёзнага шоу-канцэрта "Shakespeare Live!", прысвечанага 400-годдзяю з дня смерці У. Шэкспіра. У прадстаўленні заняты артысты В. Камбербэтч, Х. Мірэн, Д. Сушэ, Д. Дэнч і іншыя, рэжысёр – Грэгары Доран (Вялікабрытанія, 2016). У пастаноўцы прадстаўлены ўрыўкі з шэкспіраўскіх п'ес, якія аказалі ўплыў на развіццё сусветнага мастацтва: музыку, танец, оперу, музычны і драматычны тэатр. У шоу бяруць удзел трупы Каралеўскага балета, Англійскай нацыянальнай оперы, The Orchestra of the Swan і Бірмінгемскі каралеўскі балет. Прадстаўленне трансліравалася на англійскай мове з рускімі субцітрамі.

http://news.vitebsk.cc/2016/06/15/v-vitebske-vpervyie-na-bolshom-ekrane-proydet-pryamaya-translyatsiya-iz

ПРАДМОВА

"Культурнае жыццё Віцебскай вобласці" – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка "Хроніка падзей" уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 мая па 30 чэрвеня 2016 года. "Хроніка падзей" таксама ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім АМЦНТ, Браслаўскай, Віцебскай, Гарадоцкай, Дубровенскай, Лепельскай, Лёзненскай, Міёрскай, Пастаўскай, Полацкай, Сенненскай, Ушацкай, Чашніцкай, Шаркаўшчынскай, Шумілінскай раённымі сеткамі бібліятэк, Віцебскай і Наваполацкай гарадскімі сеткамі бібліятэк.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

Урачыстыя мерапрыемствы прайшлі ў Віцебску **9 мая**. На плошчы Перамогі ў гэты дзень можна было трапіць на выставы ваеннага касцюма, зброі, прадметаў ваеннага побыту, паўдзельнічаць у спартыўных гульнях, убачыць канцэртна-забаўляльную праграму з удзелам духавых аркестраў і тэатралізаваныя дзеянні з удзелам харэаграфічных калектываў. На творчых пляцоўках горада прайшлі музычныя, спартыўныя і забаўляльныя мерапрыемствы, акцыі "Запалі свечку памяці" і "Праспяваем «Дзень Перамогі» разам".

У гарадскім парку Оршы адбылася патрыятычна-адукацыйная акцыя "Мы – нашчадкі Перамогі", у Полацку **6 мая** прайшлі патрыятычныя акцыі "Навечно в памяти народной…", "Аўтобус Перамогі" (наведванне ветэранаў раёна на даму), у гісторыка-культурным комплексе "Поле ратной славы" – акцыя "Всегда в строю, а в памяти навечно", **9 мая** каля Кургана Бессмяротнасці – акцыя "Поклонимся великим тем годам…". Святочныя мерапрыемствы адбыліся і ў адкрытым пасля маштабнай рэканструкцыі мемарыяльным комплексе "Прарыў" ва Ушацкім раёне.

З **27 мая** па **5 чэрвеня** святкаў Полацк свой 1154-ты дзень нараджэння. Галоўныя мерапрыемствы свята прайшлі **28 мая** на плошчы Свабоды і на праспекце Францыска Скарыны. У іх ліку – традыцыйнае шэсце прадстаўнікоў працоўных калектываў, урачыстая цырымонія прысваення ганаровага звання "Ганаровы грамадзянін горада Полацка", уручэнне ганаровага знака "За заслугі перад Полацкам", узнагароджанне лепшых па прафесіі "Чалавек года Полаччыны", лепшых працоўных

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

З **6** па **28 мая** ў выставачнай зале ДУ "Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" працавала выстаўка народнага клуба майстроў і самадзейных мастакоў "Вытокі" Гарадоцкага Дома рамёстваў і фальклору (*вышыўка, ткацтва, жывапіс, ганчарства, лоза- і саломапляценне, цацкі-свістулькі, лялькі ў традыцыйным адзенні, вясельныя і сялянскія касцюмы з вышыўкай рэгіянальнага строю*). Падчас адкрыцця выставы быў паказаны прэм'ерны батлеечны спектакль "Два браты" ў выкананні майстроў клуба, сюжэт да якога быў знойдзены ў час экспедыцыі па раёне, прайшоў майстар-клас *Ірыны Шалаевай* па вырабе глінянай свістулькі.

Віцебскі АМЦНТ

28 мая майстры Глыбоцкага, Гарадоцкага, Чашніцкага, Талачынскага і Шаркаўшчынскага Дамоў рамёстваў прынялі ўдзел у VIII Рэспубліканскім фестывалі-кірмашы "Вясновы букет" у Лошыцкім парку г. Мінска. Гарадоцкі Дом рамёстваў і фальклору заняў I месца сярод дамоў рамёстваў рэспублікі. Першыя месцы атрымалі майстры: *Святлана Скавырка* (г. Глыбокае) у намінацыі "Роспіс па палатне", *Людміла Гаравая* (г. Гарадок) у намінацыі "Спіральнае пляценне", другія месцы: *Ірына Шалаева* (г. Гарадок) у намінацыі "Ганчарства", *Тэрэза Худзякова* (г. Чашнікі) – "Саломапляценне" і г. д. Святочнае канцэртнае афармленне майстрам стварaў народны фальклорны калектыў "Язынка" Язненскага сельскага Дома культуры Міёрскага раёна.

Віцебскі АМЦНТ

З **1** па **15 чэрвеня** ў выставачнай зале ДУ "Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" працавала выстаўка народнага клуба народных майстроў і самадзейных мастакоў "Рэнесанс" Аршанскага ГЦК.

Віцебскі АМЦНТ

17 чэрвеня адразу ў трох залах (Віцебскі АМЦНТ, краязнаўчы музей і Дом кіно) адбылося адкрыццё V Нацыянальнай выстаўкі наіўнага мастацтва "Insita-2016", прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння Алены

Фелікса Гумена і *Святланы Баранкоўскай*, сфатаграфавацца з членамі клуба гістарычнай рэканструкцыі “Хальвиль”. Адной з галоўных падзей вечара стала прэзентацыя рэспубліканскага выставачнага праекта “Князь Альгерд у выяўленчым мастацтве” (да 720-годдзя князя), імя якога звязана з Замкавай гарой і віцебскімі замкамі.

http://www.vitbichi.by/news/kultura/post8764.html

http://news.vitebsk.cc/2016/05/22/mezhdunarodnyiy-den-muzeev-v-vitebskom-hudozhestvennom-muzee/

Музей традыцыйнай культуры **21 мая** пераўвасобіўся ў японскі гарадок, на вулачках якога адбывалася шмат цікавых мерапрыемстваў. Сёлета супрацоўнікі Браслаўскага аб’яднання музеяў прысвяцілі акцыю “Ноч музеяў” Японіі.

http://www.braslav-star.by/2016/05

У абласным краязнаўчым музеі ў **маі** адбылася прэзентацыя кнігі “Павел Баранов: лётчик и художник”, створаная краязнаўцам *А. Падліпскім* і мастацтвазнаўцам *М. Цыбульскім*, і прымеркаваная да адкрыцця выставы мастака.

У музеі У.С. Караткевіча г. Оршы ў рамках супрацоўніцтва з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры (г. Мінск) адкрылася літаратурна-дакументальная выстава “Дзяды” Адама Міцкевіча: гісторыя душы…”.

Аршанская газета. – 2016. – 18 чэрв. – С. 6.

МАСТАЦТВА

23–26 чэрвеня ў Віцебску прайшоў I Міжнародны фестываль “ФотоКрок” імя С. Юркоўскага. Адначасова з правядзеннем аўтарскіх выставак (6 пляцовак), адбылася выніковая выстаўка лаўрэатаў пераможцаў міжнароднага конкурсу “Движение жизни”.

http://www.gorod212.by/news/1268222

калектываў горада і раёна, святочны канцэрт, гала-канцэрт, феерверк і танцавальна-забаўляльная праграма. У гэты ж дзень палачан і гасцей горада чакаў “Горад майстроў” з арыгінальнай пляцоўкай разьбяроў па дрэве, выставы-продажы, святочны гандаль, прэзентацыі праектаў і ініцыятыў ЕС, прадукцыі полацкіх прадпрыемстваў. **1 чэрвеня** адбыліся святочныя мерапрыемствы ў рамках ініцыятывы “Полацк – город, дружественный детям”. З **2** па **4 чэрвеня** праходзіў III Міжнародны літаратурны форум “Славянская ліра-2016”. **5 чэрвеня** ўшаноўвалі памяць святой Еўфрасінні Полацкай. У гэты дзень каля помніка прападобнай адбыўся дзіцячы фэст “Еўфрасінні – праз стагоддзі…”, Хрэсны ход у Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр, вячэрні канцэрт у Сафійскім саборы.

10 чэрвеня ў Віцебску каля сквера Маякоўскага зрабіў прыпынак “Музей-бус “Кветкі Вялікай Перамогі”. Гэта сумесны праект БРСМ і Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. У перасоўнай музейнай экспазіцыі былі прадстаўлены экспанаты, якія гавораць аб гераізме беларускага народа і адлюстроўваюць гісторыю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Не так даўно калекцыя папоўнілася яшчэ адным экспанатам – касцюмам віцебскай мяшчанкі XVIII стагоддзя, які рэканструявалі майстры культурна-гістарычнага комплексу “Залатое кальцо горада Віцебска “Дзвіна”. У скверы Маякоўскага разгарнулася работа інтэрактыўных пляцовак ваенна-патрыятычнай, спартыўнай і нацыянальна-культурнай тэматыкі. Паралельна ў малой зале Цэнтра культуры “Віцебск” прайшоў абласны этап рэспубліканскага фестывалю-конкурсу аўтарскай (бардаўскай) песні “Кветкі Вялікай Перамогі”, пераможцы якога прадставяць рэгіён у фінале 2 ліпеня ў Мінску.

http://www.belta.by/regions/view/muzej-bus-tsvety-velikoj-pobedy-priedet-v-vitebsk-na-dialog-pokolenij-/

З **10** па **12 чэрвеня** адзначалі жыхары і госці Наваполацка 58-годдзе горада. У рамках святочных мерапрыемстваў адбылося адкрыццё VIII адкрытага міжрэгіянальнага пленэра-конкурсу юных мастакоў “Палітра Прыдзвіння”, прысвечанага І.Ф. Хруцкаму, выстаўкі

дзіцячых малюнкаў горада-пабраціма Плоцка (Польшча) “Свет вачыма дзяцей”, а таксама памятнага знака “Дрэва кахання” з правядзеннем вясельнага абрада, прайшоў канцэрт лепшых творчых калектываў горада “Через духовность и культуру к созиданию и процветанию”, свята кнігі і чытання “Сустракаем лета з Пушкіным” і іншыя мерапрыемствы.

У Віцебску **15 чэрвеня** на пляцоўцы каля КЗ “Віцебск” прайшла акцыя ў рамках рэспубліканскай інфармацыйнай кампаніі “Касается даже тех, кого не касается” па прафілактыцы ВІЧ-інфекцыі пры садзейнічанні прадстаўніцтваў арганізацый ЮНІСЕФ і ЮНЭЙДС у Рэспубліцы Беларусь з удзелам салістаў групы “Да Винчи” і тэлевядучай *Святланы Баркоўскай*.

Витебские вести. – 2016. – 18 июня. – С. 24.

З **24** па **26 чэрвеня** Віцебск адзначаў 1142-годдзе. За гэты час прайшлі канцэрты, флэшмобы і перформансы, святы ветру, фарбаў і многае іншае. Галоўнымі падзеямі першага дня святкаванняў стала адкрыццё на плошчы Тысячагоддзя помніка Аляксандру Неўскаму, яго жонцы, віцебскай князёўне Аляксандры, і сыну Васілю, а таксама памятнай дошкі Марку Шагалу на аднайменнай вуліцы, тэатралізаванае прадстаўленне “Вуліца Марка Шагала – крочыла, бегла, лётала...”, перфоманс і мастацкі флэшмоб. **24 чэрвеня** ў Летнім амфітэатры адбыўся традыцыйны святочны канцэрт, а на наступны дзень на плошчы Перамогі – свята газеты “Віцьбічы”. На плошчы Тысячагоддзя ўдзельнікі клубаў гістарычнай рэканструкцыі дапамаглі перанесціся ў “Віцебск старажытны”. У скверы Маякоўскага прайшла культурна-асветніцкая акцыя прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў “Мы розныя, мы – разам”. **26 чэрвеня** адзначылі дзень вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Дзень моладзі. У гэты ж дзень у Віцебску ўрачыста была адкрыта мемарыяльная дошка ў гонар вядомага паэта і грамадскага дзеяча Давіда Сімановіча.

Аднымі з першых лаўрэатамі ганаровага звання “Віцябчанін года” сталі актрыса тэатра імя Якуба Коласа, народная артыстка Беларусі

17 мая Духоўна-гістарычная гадзіна “Нябесная заступніца Бацькаўшчыны” (*гарпасялковая бібліятэка “Дабееўскі мох”*).

21 мая Краязнаўчае падарожжа для моладзі “Без мінулага няма будучыні” (*Язвінская сельская бібліятэка*).

25 мая Пазнавальная гадзіна “Спайсы – бяда нашага часу” (*дзіцячая бібліятэка*).

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ

“Музей і культурныя ландшафты”– тэма свята гэтага года. Ідэю падхапілі і ў Віцебску, правёўшы **14 мая** традыцыйную акцыю “Ноч музеяў”. Больш за сто ўдзельнікаў стваралі святочную атмасферу ў абласным краязнаўчым музеі. Тут можна было палюбавацца выдатнымі гарадскімі краявідамі на выставе фотажурналіста *Дзмітрыя Осіпава*, атрымаць асалоду ад ігры на лыжках ансамбля СШ № 33, баяністаў, скрыпачоў, флейтыстаў з музычнага каледжа імя І.І. Салярцінскага, ансамбля “Акцэнт” Ноўкінскай ДМШ. Аматараў таямнічых гісторый сабраў тэатр ценяў “Белая панна Віцебска” (пастаноўка артыста Беларускага тэатра “Лялька” *А. Маханькова*). У час мерапрыемства праходзіла дабрачынная акцыя па зборы літаратуры для Віцебскага абласнога анкадыспансера і Ушацкага дзіцячага сацыяльнага прытулку. Папулярнасцю карысталіся гульні і квэсты “Скарбы зямлі Віцебскай”, “Рэалістычныя помнікі і пацешныя скульптуры”. Каля паўсотні мерапрыемстваў прайшлі ў ратушы на працягу чатырох гадзін. А завяршылася акцыя ў музейным дворыку фаер-шоу. У Арт-цэнтры Марка Шагала для правядзення праграмы была абраная біблейская тэматыка ў творчасці мастака. Наведвальнікі ўдзельнічалі ў віктарынах, дэманстравалі свае перавагі на выставе “Марк Шагал. Біблія. 1930–1960-я гады”. У абласным музеі Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова наведвальнікі прынялі ўдзел у гульнявым марафоне “Партызанская шлях”. **17 мая** ў Мастацкім музеі можна было паўдзельнічаць у майстар-класах

6 мая ў Тэрытарыяльным цэнтры дзённага знаходжання інвалідаў бібліёграф *цэнтральнай раённай бібліятэкі* правяла прававы калейдаскоп “Закон дыктуе жыццё”.

7 мая Патрыятычная гульня “Жыву ў Беларусі і тым ганаруся”, прысвечаная Дню Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь (*Ручайская сельская бібліятэка*).

8 мая Агляд літаратуры каля кніжнай выставы на калёсах “Балючая памяць вайны” ў аддзяленні кругласутачнага знаходжання састарэлых і інвалідаў (*Германавіцкая сельская бібліятэка*).

10 мая Гістарычны экскурс для моладзі “Ты хочаш міру? Помні аб вайне!” (*Іёдская сельская бібліятэка*).

На працягу апошняй дэкады месяца бібліятэкі сістэмы прынялі ўдзел у рэспубліканскай інфармацыйна-асветніцкай акцыі “Беларусь против табака”.

ДУК “Шаркаўшчынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

1 чэрвеня Літаратурны акорд “Вот оно, какое, наше лето!” (*Лужкаўская сельская бібліятэка*).

15 чэрвеня Выязны семінар бібліятэкараў раёна па абагульненні вопыту работы па краязнаўстве з наведваннем *Германавіцкай* і *Лужкаўскай сельскіх бібліятэк*.

У час правядзення раённага фестывалю “Прыдзісненскія крыніцы” **26 чэрвеня** бібліятэкары *цэнтральнай раённай бібліятэкі* запрашалі ўдзельнікаў свята прыняць удзел у іміджавым праекце “Бібліядвор” (выстаўка творчасці мясцовых паэтаў і пісьменнікаў “З родным словам душой падзялюся”, акцыя букросінгу, выстаўка вырабаў рукадзельніц клуба “Жаночы час”).

ДУК “Шумілінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

14 мая Конкурс да Дня сям’і “Мая сям’я – мая радасць” (*Мішневіцкая сельская бібліятэка*).

Святлана Акружная і дырэктар тэлерадыёкампаніі “Віцебск” *Алена Панцюхова*. Новае званне (плануецца, што яно будзе прысвойвацца штогод) заснавана гарвыканкамам і прадугледжвае пяць намінацый: “Падзея года”, ”Праект года”, “Мецэнат года”, “Дэбют года”, “Грамадскае прызнанне”. Узнагароджанне лаўрэатаў прайшло ў час святкавання Дня горада.

24–26 чэрвеня Орша адзначала 949-ю гадавіну. У рамках святочных мерапрыемстваў адбыўся канцэрт творчых калектываў устаноў культуры і адукацыі Аршанскага раёна “Песняй славім горад на Дняпры”, канцэрт групы “Питер Пен”, арт-групы “Вдохновение” і “Легенды Кавказа” (г. Мінск), прайшла канцэртная праграма творчых калектываў гарадскога Цэнтра культуры “Перамога”.

http://www.orshanka.by/?p=30927

Калектыву Цэнтра культуры “Віцебск” – народнаму тэатру-студыі сучаснай харэаграфіі Дзіяны Юрчанка прысуджана прэмія і званне дыпламанта Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Узнагароды калектыў удастоены за творчыя дасягненні 2015 года, паспяховае выступленне на Нацыянальным конкурсе XXVIII Міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі ў Віцебску.

На сесіі Талачынскага райвыканкама было разгледжана пытанне “Аб рабоце ўстаноў культуры па абслугоўванні насельніцтва раёна” і прапанавана работнікам культуры праграма дзеянняў на перспектыву. Сярод іншага было адзначана, што да аказання платных паслуг трэба падыходзіць нетрадыцыйна (падключацца да правядзення ўрачыстасцяў, абрадаў і г. д.). Аддача некаторых устаноў аказваецца неадэкватнай укладанням, на конкурсах, аглядах раён у вобласці прадстаўляюць адны і тыя ж. Не рэалізуецца да канца патэнцыял гісторыка-краязнаўчага музея Талачынскага краю. Кіраўніком раёна пастаўлена задача – кардынальна змяніць работу ўстаноў культуры і аддзела райвыканкама, якія займаюцца гэтымі пытаннямі.

http://www.natal.by/category/%D0%BA%D1%83%D0%BB%D1%8C%D1

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

У сярэдзіне **мая** Браслаўскі і Міёрскі раёны наведала дэлегацыя Саюза сельскіх гмін Падляскага ваяводства на чале з паслом Рэспублікі Польшча ў Беларусі Конрадам Паўлікам. Мэта візіту – больш блізкае знаёмства з жыццём і культурай насельніцтва заходніх рэгіёнаў краіны. Госці наведалі касцёлы ў Браславе, Міёрах і Друі, сустрэліся са святарамі, пабывалі ў музеях і на прамысловых прадпрыемствах.

Витебские вести. – 2016. – 26 мая. – С. 2.

У **маі** на Гарадоччыне пабывалі прадстаўнікі г. Бабаева Валагодскай вобласці Раіі. Гэта ўжо не першы візіт расіян – у 2012 годзе было падпісана пагадненне аб партнёрскіх адносінах паміж гарадамі. У рамках мерапрыемстваў сустрэчы госці наведалі мясцовыя Дом культуры і Дом рамёстваў, а таксама іншыя арганізацыі раёна.

Витебские вести. – 2016. – 31 мая. – С. 1.

У Полацка з'явіліся два новыя пабрацімы ў Расійскай Федэрацыі – горад Канск Краснаярскага краю і Заходнедзвінскі раён Цвярской вобласці. Дагавор аб супрацоўніцтве з раёнам Цвярской вобласці быў падпісаны ў час святкавання 1154-годдзя Полацка.

Витебские вести. – 2016. – 31 мая. – С. 1

10 чэрвеня ў Латвіі на Дні г. Даўгаўпілса выступілі творчыя аб'яднанні Цэнтра культуры "Віцебск" – народны тэатр-студыя сучаснай харэаграфіі, народны тэатр песні і музыкі "Прасторы" і шоу-група "Инспектор ЖУFF".

http://www.gck.by/2016/06/10455

У **чэрвені** гарады Дуброўна і Вулканешты Гагаўзскай аўтаноміі Рэспублікі Малдова падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве ўстаноў адукацыі і культуры, у тым ліку абмене спартыўнымі і мастацкімі калектывамі. Акрамя таго, у рамказх святкавання Дня горада было падпісана пагадненне аб сяброўстве і супрацоўніцтве паміж установай дадатковай адукацыі "Дзіцячая школа мастацтваў імя кампазітараў Яруліных г. Мамадыш" Рэспублікі Татарстан і Дзіцячай школай мастацтваў Дуброўна.

Витебские вести. – 2016. – 18 июня. – С. 1.

клубам "Спарта" пры ўдзеле пярвічнай арганізацыі РГА "Белая Русь").

23–24 чэрвеня Бібліятэчны бульвар "Бібліятэка пад адкрытым небам" (бібліятэчная выстаўка, букросінг, акцыя "Падары кнігу бібліятэцы", выступленне народнага тэатра кнігі "Пятрушка", танцавальны флэшмоб і інш.) (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

ДУК "Ушацкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма"

На працягу месяца ў бібліятэках раёна адбыліся наступныя мерапрыемствы: гутарка "Пасха – светлый праздник" (*Глыбачанская сельская бібліятэка*), святочны вечар "От первых выстрелов и до победного салюта" (*Сарочынская сельская бібліятэка*), вечар адпачынку "Счастлив тот, кто счастлив дома" (*Вяркудская сельская бібліятэка*), табак-шоу "Курильщик – сам себе могильщик" (*Вялікадолецкая сельская бібліятэка*).

ДУК "Чашніцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма"

У **маі** прайшла сустрэча з беларускім пісьменнікам *У. Ягоўдзікам* "Добрым кнігам – добры шлях" (*дзіцячая раённая* і *Чырвонараніцкая сельская бібліятэкі*), супрацоўнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі арганізавалі сустрэчу з пісьменнікам-земляком, членам народнага аб'яднання паэтаў "Млын" *М. Яршовым* "Сын сваёй зямлі".

24 мая адбыўся тэматычны семінар бібліятэчных работнікаў раёна "Праваслаўная кніга ў рабоце бібліятэк" (*Альшанская сельская бібліятэка*).

ДУК "Шаркаўшчынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма"

3 мая "Бібліяноч-2016" пад дэвізам "Натхненне прыходзіць ноччу", у праграме: фальклорная вечарына "У Лявоніхі на Вялікдзень", прэзентацыя работ майстрыц аматарскага аб'яднання "Жаночы час", паэтычны панадворак "Весна – пора любви, пора мечтаний", з удзелам мясцовых паэтэс *К. Сосна* і *С. Клімзы*, адкрыццё выставы карцін "З вясною ў душы" мастака А. Шыёнка і іншыя мерапрыемствы (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

16 чэрвеня Прэзентацыя-выстаўка работ члена народнага клуба майстроў і мастакоў “Мастер” Полацкага раённага цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур *Людмілы Міхайлаўны Шайтар* “Маё майстэрства – землякам” (*Шпакоўшчынская сельская бібліятэка-клуб*).

ДУК “Сенненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

9 мая супрацоўнікамі ЦБС у рамках раённага свята арганізавана тэатралізаваная тэматычная пляцоўка “На привале”.

15 мая, у Міжнародны дзень сям’і, у бібліятэках раёна былі праведзены наступныя мерапрыемствы: свята “Что важней всего на свете – мир, семья, любовь и дети” (*Багушэўская гарпасялковая бібліятэка*), паэтычны калейдаскоп “Семейные посиделки” (*Ходцаўская сельская бібліятэка*), літаратурна-музычная кампазіцыя “Моя семья – надежда и опора” (*Ульянавіцкая сельская бібліятэка*), гульнявыя праграмы “Остров семейных сокровищ” (*Студзёнкаўская сельская бібліятэка*), “Выходной с семьёй” (*Алексініцкая сельская бібліятэка*).

Да Сусветнага дня без тытуню былі прымеркаваны ўрок-пратэст “Курить – себе вредить” (*Машканская сельская бібліятэка*), урок здароўя “Жизнь без табака” (*Какоўчынская сельская бібліятэка*), гутарка-сустрэча “Мой выбор – не курить” (*Рыбненская сельская бібліятэка*) і інш.

У рамках праграмы летняга чытання “Лета з добрай кнігай” у **чэрвені** ў бібліятэках сістэмы адбыліся: літаратурна-забаўляльная праграма “Пусть будет небо мирным над землёй, пусть вечно детство звонкое смеётся” (*Сінягорская бібліятэка-музей этнаграфіі*), конкурсна-гульнёвая праграма “Детство – это смех и радость” (*Чырвонасельская сельская бібліятэка*), свята “Мір усім дзецям на планеце” (*Багушэўская гарпасялковая бібліятэка*), тэатралізаванае прадстаўленне “Будуем церамок” (*Ходцаўская сельская бібліятэка*) і інш.

22 чэрвеня Патрыятычная акцыя “Нам сорок первый не забыть” (*цэнтральная раённая бібліятэка сумесна з Ульянавіцкай школай, раённым камітэтам камуністычнай партыі, ваенна-патрыятычным*

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА.
САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

КЛУБНАЯ СПРАВА

У рамках XIV Пасхальнага фестывалю ў Віцебску з **30 красавіка** па **29 мая** ў ДУ “Культурна-гістарычным комплексе “Залатое кальцо горада Віцебска “Дзвіна” прайшла выстаўка-конкурс дзіцячай творчасці “Божий мир глазами детей”.

http://vitprav.by/9495.html

5 мая ў выставачнай хале “Духаўскі круглік” адбылася першая сустрэча ў рамках новага праекта “Паэтычныя дыялогі”, прысвечаная творчасці Б. Акуджавы.

http://www.gck.by/2016/05/10349

II адкрыты рэгіянальны фестываль батлеечных тэатраў “Чароўны свет батлейкі” адбыўся **15 мая** на базе сектара культуры і дасуга “Залескі Дом культуры” Гродзенскай вобласці, у ім прынялі ўдзел калектывы васьмі батлеечных тэатраў. Дыпломам у намінацыі “За папулярызацыю батлеечнага мастацтва” быў узнагароджаны тэатр лялек “Докшыцкая батлейка Патупчыка” (г. Докшыцы), дыплом за лепшы спектакль сярод калектываў са званнем народны атрымаў народны тэатр лялек “КапялюШ” г. Наваполацка (кіраўнік *А. Рэцікаў*).

http://gromc.by/news/news-renderer/novosti-235/page-10.html

26 мая Дубровенскі раённы Дом культуры адсвяткаваў 65-гадовы юбілей з дня адкрыцця. Гасцей свята ўрачыста сустракаў духавы аркестр, у фае былі прадстаўлены выстаўкі і фотаэкспазіцыі, адбыўся канцэрт самадзейных калектываў раёна.

http://www.dubrovno.by/

27 мая ў Летнім амфітэатры 25-гадовы юбілей адзначыла газета “Віцьбічы”. У святочным канцэрце прымалі ўдзел наступныя калектывы і выканаўцы: узорны ансамбль бальнага танца “Мозаика”, узорны аматарскі калектыў “Альтанка”, заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь

харэаграфічны ансамбль танца “На ростанях” і арт-гурт “Фьюжн” Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў, шоу-група “Здравствуй, Антонио”, заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль танца “Лявоніха”, заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль класічнага танца “Піруэт” дзіцячай школы мастацтваў № 1 г. Віцебска, народны тэатр-студыя сучаснай харэаграфіі Дзіяны Юрчанка, народны тэатр песні “Прасторы” Цэнтра культуры “Віцебск” і шоу-балет “Сенсацыя”, *Хрысціна Чэн, Сяргей Дзмітрачэнка*, шоу-група “Какао”, салістка ўзорнай студыі эстраднай песні “Форум” *Ліза Крупянькова*, народны тэатр гульні і студыі сцэнічнага майстэрства “Арт-праект”, а таксама госці свята – група “Дразды”.

http://www.vitbichi.by/news/25-letie-vitbichey/post8945.html

29 мая ў г. п. Лёзна адбылося свята, прысвечанае Дню дзяцінства “Добры дзень, лета!”. У рамках якога прайшлі наступныя мерапрыемствы: “Лялечны кірмаш-2016”, тэатралізаваны мультпарад “У краіне казак”, тэатралізаваны гала-канцэрт дзіцячых творчых калектываў раёна “Суквецце маладых талентаў Лёзненшчыны”, акцыя МНС “Не оставляйте детей одних” (конкурсная гульнявая праграма для бацькоў, віктарына, дэманстрацыя аварыйна-выратавальнай тэхнікі) і інш.

25-годдзе творчай дзейнасці адзначыў у **маі** заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь тэатр танца “Прэм’ер-Спонайд” (г. Полацк)

http://www.pvestnik.by/?p=27657

У апошні дзень **мая** ў Віцебску адбыўся першы беларуска-італьянскі канцэрт у рамках сумеснага праекта “Горные хоры”. У КЗ “Віцебск” выступілі ўзорныя творчыя калектывы абласнога палаца дзяцей і моладзі – вакальна-харавы “Дзвіна” пад кіраўніцтвам *В. Фальковіч* і вакальная студыя “Ассоль” (мастацкі кіраўнік *А. Фальковіч*), а таксама мужчынскі хор Coro Laurino (дырыжор *Вернер Рэдолфі*) з італьянскага горада Бальцана, фіналіст фестывалю Sanremo music awards рэпер *Франчэска Юрлана*.

http://www.vitbichi.by/news/kultura/post9050.html

бібліятэка).

10 чэрвеня Паэтычнае свята “Пакуль пяём на роднай мове мы, жыве зямля бацькоў, жыве Радзіма” з удзелам членаў літаратурнай суполкі “Уздым” г. Даўгаўпілс (Латвія) (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

17 чэрвеня Семінар бібліятэчных работнікаў *Пастаўскай ЦБС* “Организация свободного времени детей и подростков”.

ДУК “Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

2 мая Сустрэча “Ёсць у памяці імгненні вайны” навучэнцаў школы № 10 з ветэранамі *А.У. Збароўскім, У.А. Дзятлавым* і *Н.У. Азернікавай* (*дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога*).

4 мая Свята “Веселится народ – праздник Пасхи у ворот” з удзелам фальклорнага калектыву “Лецейка” ДУА “Гомельская дзіцячая школа мастацтваў Полацкага раёна” (*Багатырская сельская бібліятэка*).

8 мая Паэтычнае мерапрыемства “Этот мир завещено беречь” каля памятнага знака літары “Ў” у рамках іміджавага праекта выхаднога дня “Поэтический open-air “Стихи над городом” (*бібліятэкі РЦБС*). Удзел у праграме прынялі прадстаўнікі органаў пагранічнай службы. На адкрытай пляцоўцы былі прадстаўлены франтавая бібліятэка, экспазіцыя паштовак “Гарады-героі”, акцыя “Белыя жураўлі”.

15 мая Сямейная праграма з удзелам народнага клуба “Играй гармонь, любимая-полочаночка” (*бібліятэкі РЦБС*).

2 чэрвеня Бібліяноч “Я ў гэтым горадзе жыву – я гэты город ведаю” (*бібліятэка-філіял № 8*).

7 чэрвеня Віртуальнае падарожжа па краінах свету “День пирата и другие необычные праздники мира” для падлеткаў аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў (*дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога*).

10 чэрвеня Літаратурны вечар “Вандроўкі з У.І. Ягоўдзікам” для наведвальнікаў школьнага лагера СШ № 16 (*бібліятэка-філіял № 8*).

14 чэрвеня Вандроўка па кнігах пісьменніка А. Волкава “Адкрыў Ізумрудны горад” (*бібліятэка імя Я. Купалы*).

буктрэйлер па кнізе Б. Васільева ”В списках не значился…”, віртуальнае падарожжа ў Брэст “Я – крэпасць”, гістарычнае адкрыццё “Лёзна. 22 чэрвеня 1941” з кнігай “Тот самый длинный день в году...”.

ДУК “Лепельская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

1–30 чэрвеня Выстаўка работ навучэнцаў Лепельскай дзіцячай школы мастацтваў “Вясеннія фарбачкі” (*галерэя “Арт-Лепель”, цэнтральная раённая бібліятэка*).

20 чэрвеня Конкурсна-забаўляльная праграма “Планета детства, или Приключения волшебного Фантика” (*дзіцячая бібліятэка*).

17 чэрвеня Бібліятэка пад адкрытым небам “Книга вышла погулять” (*Горская сельская бібліятэка*).

ДУК “Міёрская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

У **маі** ў бібліятэках сістэмы прайшлі наступныя мерапрыемствы: літаратурна-музычная вечарына “Паэзія подзвігу” (*Міёрская дзіцячая бібліятэка*), інфармацыйны гадзіна “Ведай і шануй сваю сімволіку” да Дня Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь (*Крукаўская сельская бібліятэка*), свята “Пад сямейным абажурам” (*Навапагосцкая сельская бібліятэка сумесна з СДК*), акцыя “Над пропастью привычки”, прысвечаная Сусветнаму дню без тытуню (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

ДУК “Пастаўская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

8–31 мая Кніжная выстаўка-агляд “Вайна! Твой страшны след…” для чытачоў старэйшага школьнага ўзросту (*Варапаеўская гарпасялковая бібліятэка*).

13 мая Сямейны квэст “Таямніцы роднага горада” (*дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі*).

15 мая Музычная кампазіцыя “Мелодыя яе душы”, прысвечаная 110-годдзю з дня нараджэння К. Шульжэнкі (*Лынтупская гарпасялковая*

У **чэрвені** на базе аграгарадка Акцябрская Віцебскага раёна прайшло раённае свята “Няхай заўжды будзе дзяцінства”. У час мерапрыемства адбыўся агляд калектываў дэкаратыўна-прыкладной творчасці клубных устаноў, раённы конкурс дзіцячай вакальнай творчасці “Прекрасен мир поющий”, пленэр ганчароў “Гліна спявае”. Навінкай стала адкрыццё цэху рамеснікаў, які прадставілі супрацоўнікі раённага гісторыка-краязнаўчага музея.

http://www.pridvinje.by/2016/06/na-baze-ag-oktyabrskaya-vitebskogo-rajona-proshel-rajonnyj-prazdnik

24-гадовы танцор *Антон Пануфнік* з Віцебска стаў пераможцам харэаграфічнага шоу тэлеканала ТНТ “Танцы. Битва сезонов”.

У абласной філармоніі адбыўся канцэрт, прысвечаны 10-годдзю ўзорнага харэаграфічнага калектыву “Акцэнт”, які працуе на базе СШ № 40 і Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Першамайскага раёна Віцебска. У мерапрыемстве прынялі ўдзел дзіцячая мастацкая студыя “Рознакаляровая планета”, заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль танца “Лявоніха”, заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль класічнага танца “Піруэт”, народная студыя сучаснага танца Ірыны Бухавіцкай.

http://www.vitbichi.by/news/kultura/post8993.html

11 чэрвеня ў Талачыне стартаваў культуралагічны праект “Зорнае лета-2016”, і адкрыла яго свята “Вясёлка планеты дзяцінства” (канцэрт-конкурс “Юные дарования”, конкурс культарганізатараў “Гульнявыя забавы-2016”, конкурс малюнкаў на асфальце, майстар-клас па танцах і інш.)

http://www.natal.by/category/%D0%BA%D1%83%D0%BB%D1%8C%D1

16 чэрвеня ў Летнім амфітэатры адбыўся гала-канцэрт “Віват фестываль!” з удзелам творчых калектываў ДУ “Цэнтр культуры “Віцебск” і УП “Віцебскаблгаз”. На галоўнай канцэртнай пляцоўцы Віцебска свае нумары прадэманстравалі заслужаныя аматарскія

калектывы Рэспублікі Беларусь ансамбль танца “Лявоніха” і харэаграфічны ансамбль “Зорька”, узорны ансамбль танца “Егоза”, народны тэатр песні і музыкі “Прасторы” і ўзорная дзіцячая студыя эстраднай песні “Форум”, ансамбль гарманістаў “Забава”, харэаграфічныя ансамблі “Карнавал” і “Премьера” і іншыя калектывы. Грашовыя сродкі, атрыманыя ад рэалізацыі білетаў на гала-канцэрт, былі накіраваны на падрыхтоўку і правядзенне XXV Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”.

http://www.gck.by/2016/06/10427

18 чэрвеня ў аграгарадку Дабрамыслі Лёзненскага раёна адбыўся гала-канцэрт удзельнікаў фестывалю-конкурсу “Крыніца талентаў”, які стартаваў у студзені 2016 года. На працягу пяці месяцаў канкурсантамі было падрыхтавана каля 150-ці творчых нумароў, у праекце прынялі ўдзел 45 чалавек ва ўзросце ад 5 да 75 гадоў, якія праявілі сябе ў розных жанрах – музычным, вакальным, харэаграфічным, тэатральным і арыгінальным. Пераможцамі сталі: танцавальны калектыў “Нон-стоп” (кіраўнік *М. Гусакова*) (Гран-пры), *Паліна Федарэнкава* (дыплом I ступені), *Юрый Крысак* (II месца), аўтар-выканаўца *Сяргей Агееў* (III месца).

http://www.lioznonews.by/culture/%D0%B3%D0%B0%D0%BB%D0%B0

4–5 чэрвеня прадстаўнікі нацыянальных культур Віцебшчыны прымалі ўдзел у **Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур** у г. Гродна. У канцэртных праграмах фестывалю “Мы тут выраслі”, “Сугучча”, “Намалюю табе зоры”, на нацыянальных падворках выступілі прадстаўнікі Віцебшчыны: *Яраслаў Еўтушэўскі* (г. Барань), *Дзіяна Ерыцян* (Лепельскі раён), творчая сям’я *Сяргея Філіпава* (г. Міёры), інструментальны калектыў з г. Верхнядзвінска, *Яўген Клямят* і *Раіса Піталенка* (г. Віцебск), народны клуб нацыянальных культур “Дружба” (Іллюшынскі СДК, Ушацкі раён), інструментальны калектыў дзіцячай школы мастацтваў г. Верхнядзвінска.

Віцебскі АМЦНТ

ДУК “Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

13 мая ў рамках карпаратыўнага праекта “Белорусские смоляне, смоленские белорусы” ў памяшканні ваенна-гістарычнага музея адбыўся круглы стол “Времён и судеб неразрывна связь”. Удзельнікамі мерапрыемства сталі прадстаўнікі Смаленскага дзяржаўнага ўніверсітэта, ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна”, цэнтральнай раённай бібліятэкі, мясцовыя краязнаўцы.

15 мая Бібліявечар “Сплотить семью поможет мудрость книг” (*цэнтральная раённая і дзіцячая бібліятэкі*).

15 мая Сямейны рынг знатакоў “Читаешь ты, читаю я, читает вся моя семья” (*сельская бібліятэка аграгарадка Адаменкі*).

16 мая ў рамках правядзення Міжнароднага дня дзяцінства адбылася выстава-конкурс “Лялечны кірмаш-2016”, арганізаваная аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Лёзненскага райвыканкама. Бібліятэкары раёна прадставілі выставу “Беларуская лялька на бібліятэчнай пляцоўцы”

31 мая Супрацоўнікі ЦБС раёна прынялі ўдзел у Міжнародным семінары “Библиотека как центр духовно-нравственного воспитания”, арганізаваным работнікамі Руднянскай і Лёзненскай ЦБС у г. Рудня Смаленскай вобласці (Расійская Федэрацыя).

17 чэрвеня Сустрэча-дыялог “Наркаманія: погляд на праблему” з намеснікам пракурора Лёзненскага раёна *А.А. Лапушынскім*, фельчарам наркалагічнага кабінета раённай паліклінікі *В.В. Каралёвай*, інспектарам ІСН Лёзненскага РАУС *Я.А. Курневіч* і галоўным спецыялістам РА БРСМ *В.Р. Мядзведзевай* (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

22 чэрвеня Мерапрыемства да Дня памяці і смутку “Ранним утром на рассвете...” (*цэнтральная раённая бібліятэка сумесна з ваенна-гістарычным музеем*).

22 чэрвеня Дзень ваеннай кнігі “Тот самый длинный день в году...” (*дзіцячая бібліятэка*). У праграме: выстава-памяць “Так пачыналася вайна”, выстава-салют “1418 дзён. Ад Брэста да Берліна”,

мудрость книг” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

19 мая Выстава-гульня па кнізе пісьменніка В. Віткі “Край роднага слова” (*Межанская сельская бібліятэка*).

27 мая ў *цэнтральнай раённай бібліятэцы* прайшоў дзень павышэння кваліфікацыі бібліятэчных работнікаў “Клубныя фарміраванні – адзін з напрамкаў арганізацыі дасуга карыстальнікаў публічнай бібліятэкі”.

1 чэрвеня Тэатралізаванае свята “В краски яркие одето к нам опять приходит лето”, прысвечанае Міжнароднаму дню абароны дзяцей (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

5 чэрвеня ў *цэнтральная раённая бібліятэка* ў рамках раённага свята народнай творчасці, беларускай паэзіі і фальклору “Гарадоцкі Парнас-2016” прадставіла кніжную выставу “Ці знаў з вас, хлопцы, хто Тараса?”, дэгустацыю страў з рэцэптамі “Стравы ад Тараса”, кніжны развал. Супрацоўнік бібліятэкі ўдзельнічаў у велапрабегу “Сцежкамі Тараса”.

15 і **16 чэрвеня** Свята-гульня “Падарожжа ў родную хатку” ў рамках праекта “Чытаем па-беларуску” (*цэнтральная раённая бібліятэка).*

ДУК “Дубровенская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

9 мая Акцыя “Франтавая бібліятэка” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

11 мая Літаратурна-музыкальная кампазіцыя “Літаратурнае эха вайны” (*дзіцячая бібліятэка*).

15 мая Бенефіс чытаючай сям’і “Сямейныя сустрэчы” (*Асінторфская сельская бібліятэка).*

13 чэрвеня Тэатралізаване прадстаўленне па казцы А. Талстога “Залаты ключык”для чытачоў малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту (*дзіцячая бібліятэка*).

26 чэрвеня ў Шаркаўшчыне прайшоў раённы фестываль “Прыдзісненскія крыніцы”, на якім ушаноўвалі лепшых працаўнікоў сяла па выніках вясенняй пасяўной кампаніі, моладзь, выступалі лепшыя калектывы аматарскай мастацкай творчасці раёна. У час святочных мерапрыемстваў працавалі выстаўкі работ майстроў Цэнтра рамёстваў, Дома ганчара, дзіцячых работ навучэнцаў Цэнтра дзяцей і моладзі, работ па выніках пленэра Шпогскай (Латвія) і Шаркаўшчынскай ДМШ. Святочны настрой гледачам сваімі музычнымі і танцавальнымі нумарамі стваралі лепшыя калектывы мастацкай самадзейнасці гарадскога пасёлка і раёна. Павіншаваць шаркаўчан з Днём моладзі і Днём горада з песеннай праграмай завіталі ўдзельнікі эстраднай студыі Міёрскага раённага Дома культуры.

http://www.klich.by/?p=42752

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

У канцэртнай зале Віцебскай абласной філармоніі **4 мая** ў рамках праекта “Салют талантов” адбыўся **III Міжнародны фестываль-конкурс дзіцячай і юнацкай творчасці “На легендарной сцене”**. Перад гледачамі выступілі ўдзельнікі з трынаццаці гарадоў Расіі, Беларусі і Узбекістана. У рамках фестывалю адбыўся майстар-клас на тэму “Артыстызм і яго выражэнне праз пластычныя элементы”, які правёў заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь *Юрый Кавалёў*. Лепшымі балетмайстрамі прызнаны *Ірына Нікалаева* (г. Санкт-Пецярбург) і *Алена Лапаціна* (г. Перм), лепшым канцэртмайстрам стала *Алена Шчамялёва* з Віцебска, уладальнікам Гран-пры фестывалю – юная цымбалістка з Віцебска *Вольга Скарынава*.

Віцьбічы = Витьбичи. – 2016. – 17 мая. – С. 7.

Каля 200 гасцей з абласнога цэнтра, Віцебскага раёна і нават сталіцы сталі ўдзельнікамі **свята “Гулі ў бабулі”**, якое адбылося **14 мая** ў аграгарадку Заронава. Фэст на свежым паветры быў запланаваны як

выпускны баль слухачоў курсаў “Мова нанова”. Яго гасцямі сталі кіраўнік студыі фларыстычных кампазіцый “Салекс” *А. Пятрова*, разьбяр па дрэве *М. Зінькоў,* актрыса Нацыянальнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа *Р. Грыбовіч,* гурт “Re1ikt” і іншыя.

Віцьбічы = Витьбичи. – 2016. – 21 мая. – С. 5.

Абласны цэнтр упершыню прымаў **Міжнародны фестываль патрыятычнай песні “Солдаты отечества”**, прысвечаны 71-й гадавіне перамогі і 28-й гадавіне пачатку вываду савецкіх войск з Афганістана. Віцебскі форум сабраў каля 100 выканаўцаў з сямі краін – Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі, Малдовы і Казахстана. Сярод іх былі ўдзельнікі ваенных дзеянняў, ветэраны лакальных войн і ваенных канфліктаў. Патрыятычныя песні гучалі на дзвюх канцэртных пляцоўках Віцебска: конкурсная праграма прайшла **14 мая** ў абласной філармоніі, фінальны гала-канцэрт – **15 мая** ў Летнім амфітэатры. Выступленні канкурсантаў ацэньвала журы на чале са старшынёй камітэта па справах воінаў-інтэрнацыяналістаў пры савеце кіраўнікоў урадаў дзяржаў-удзельніц СНД і аргкамітэта фестывалю *Аляксандрам Кавалёвым* і сустаршынёй – народным артыстам Беларусі *Анатолем Ярмоленкам*. Члены журы прысудзілі два Гран-пры: вакальнаму ансамблю народнай студыі эстрадных спеваў “Крэатыў” з Оршы ў намінацыі “групы” і *Вадзіму Ваўку* з Малдовы ў намінацыі “выканаўца”. У намінацыі “аўтарская песня” першае месца прысуджана *Аляксандру Ярохіну* з Разані. У намінацыі “выканаўца” першынствавалі мінчане *Наталля Сянько* і *Кацярына Кузьміч,* другое месца заваявалі віцябляне *Мікіта Саха* і *Дзмітрый Латковіч,* трэцяе – *Святлана Казьміна* з Полацка. У намінацыі “група” першае месца дасталася расійскаму калектыву “Іван” з Чэхава. Наступны форум плануецца правесці на радзіме аднаго з уладальнікаў Гран-пры – у Малдове.

http://www.vitbichi.by/news/politika/patrioticheskoe_vospitanie/post8743.html

20 мая ў Летнім амфітэатры г. Віцебска адбыўся **гала-канцэрт** мастацкай самадзейнасці творчых калектываў і выканаўцаў Віцебскай

Беларусі *Барыс Крапак*, беларускі мастак *Мікалай Стас*. Падчас прэзентацыі адбылася тэлефонная размова па гучнай сувязі з салістам “Песняроў” *Леанідам Барткевічам* (*Слабодкаўская сельская бібліятэка*).

ДУК “Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма ”

З **1** па **12 мая** Акцыя “Фота з сямейнага альбома ветэрана” (*Курынская сельская бібліятэка*).

6 мая ў час раённага свята, прысвечанага Дню Перамогі, бібліёбус быў пераўтвораны ў міні-музей “Поезд Перамогі” з выставай-інсталяцыяй “Вайна ў лёсе маей сям’і”. Увазе гасцей была прапанавана выстава-рэквіем “Чтим подвиг! Гордимся Победой!” і дарожны кніжны чамадан “Лепшыя кнігі аб вайне” (букросінг).

19 мая Семінар бібліятэчных работнікаў раёна “Вольны час у бібліятэцы: арганізацыя, рэклама і правядзенне мерапрыемстваў” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

27 мая Адкрыццё мастацкай выставы *Алега Кірушкіна* “Дарога жыцця” з удзелам мастакоў Віцебшчыны і навучэнцаў Старасельскай ДШМ. На выставе былі прадстаўлены карціны, прысвечаныя аварыі на ЧАЭС, і пейзажы Беларусі (*Кіраўская сельская бібліятэка*).

ДУК “Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк”

3 мая Юбілейны творчы вечар кандыдата псіхалагічных навук, паэтэсы, публіцыста, празаіка і грамадскага дзеяча *Наталлі Саветнай* “Я взглядом прорастаю в небо” (*цэнтральная раённая бібліятэка*). У ім прынялі ўдзел пісьменнікі *Г.Б. Пацыенка* і *М.П. Кузьміч*, а таксама старшыня Мінскага гарадского аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі *М.П. Паздняковў*, які ўручыў пісьменніцы медаль “За большой вклад в литературу”.

19 мая Дзень сямейнага адпачынку “Семью сплотить сумеет

ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка”

Да Дня Перамогі ў *бібліятэцы імя У. Караткевіча* прайшла традыцыйная акцыя падзякі і ўвагі “Цветы ветерану”, у час якой юныя актывісты бібліятэкі павіншавалі ўдзельнікаў вайны на даму.

4 мая Майстар-клас “Открытка ветерану” (*бібліятэка імя К. Сіманава*). Супрацоўнікі *бібліятэкі г. п. Баравуха* арганізавалі для жыхароў пасёлка акцыю “Бессмертный полк”.

15 мая Сустрэча з паэтэсай *Г. Аляскеравай-Загнетавай* і выхаванцамі нядзельнай школы ў рамках святкавання Дня жонак-міраносіц (*бібліятэка імя Я. Коласа*).

17 мая Сустрэча “Открытое сердце” са старшынёй Наваполацкай гарадской арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа *Л.У. Лашковай*, прысвечаная 95-годдзю арганізацыі (*бібліятэка імя Я. Коласа*).

ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Браслаўскага раёна”

2–31 мая Месячнік патрыятычнага выхавання “День нашей гордости и боли” ў *цэнтральнай раённай бібліятэцы* (літаратурна-музычная гадзіна “Песні ваенных гадоў”, гадзіна гісторыі і краязнаўства “Браслаўшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны” з удзелам навуковага супрацоўніка краязнаўчага музея *І. Вашкеля*, гадзіна разважанняў “Книги, которые потрясли нас”, літаратурны парад ваеннай кнігі “Святая памятная дата” і інш.).

19 мая Семінар бібліятэчных работнікаў “Публічная бібліятэка рэгіёна: сучасны фармат” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

8 чэрвеня Дзень духоўнасці “Еўфрасіння Полацкая – слава зямлі беларускай” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

26 чэрвеня Прэзентацыя кнігі “Владимир Мулявин. “Сэрцам і думамі…”. У мерапрыемстве прынялі ўдзел аўтар праекта, рэдактар-складальнік кнігі *Людміла Крушынская*, заслужаны дзеяч мастацтваў

вобласці “Беларусь на шляху да культуры свету”, прысвечаны Году культуры. Удзел у ім прынялі зводны хор у колькасці 500 чалавек, ансамбль барабаншчыц больш за 200 чалавек, аркестр народных інструментаў і г. д.

Віцебскі АМЦНТ

28–29 мая Міжнароднае свята традыцыйнай культуры “Браслаўскія зарніцы” пачалося двума абласнымі мерапрыемствамі. У раённым цэнтры культуры ў пяты раз прайшоў агляд-конкурс вакальна-харавых калектываў “Браслаўская харавая асамблея”, а на пляцоўцы “Брукоўка” – у трэці раз абласны конкурс беларускіх побытавых танцаў. Абодва сабралі дзясяткі таленавітых калектываў з усёй Віцебшчыны. На працягу дзвюх гадзін са сцэны гучалі народныя і сучасныя песні. Лепшымі ў сваіх намінацыях прызнаны народны хор “Спадчына” з Шаркаўшчыны і народны камерны жаночы хор з Наваполацка. Турнір беларускіх побытавых танцаў праводзіўся сярод трох узроставых груп. Гран-пры конкурсу ў намінацыі “Адметны танец” атрымалі прадстаўнікі Лёзненскага раёна. Пары з Ушацкага, Чашніцкага, Полацкага, Браслаўскага, Глыбоцкага, Лепельскага, Шумілінскага, Гарадоцкага раёнаў сталі дыпламантамі турніру. Свае дэлегацыі на свята даслалі Літва, Латвія, Эстонія, Польшча, Расія, Венесуэла.

28 мая прайшоў **фестываль сярэдневяковай культуры “Меч Брачыслава”**, які з’яўляецца адной з разынак міжнароднага свята “Браслаўскія зарніцы”. Паўдзельнічаць у ім прыехалі з Віцебска, Полацка, Мінска, Ліды, Брэста, а таксама Латвіі і Польшчы. У гала-канцэрце прынялі ўдзел браслаўскі гурт “На панадворку”, танцавальны ансамбль “Шахрай” з Легіёнаўскага павета Польшчы, госці з Расіі – народны эстрадна-харэаграфічны калектыў “Калібры” і Міхееўскі народны харавы калектыў. Яркімі касцюмамі і палымянымі рухамі зачараваў гледачоў калектыў венесуэльскага фальклорнага танца “Сандра Радрыгас”, удзельнікам якога з’яўляецца першы сакратар пасольства Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла ў Беларусі Херарда Эстрада Марцінас. Цёпла

прыняла публіка калектывы “Жемчужина” і “Заряница” з Вялікіх Лук (Расійская Федэрацыя), вакальны ансамбль “Рэтра” з Даўгаўпілса (Латвія), спевакоў з літоўскага Вісагінаса, заслужаны аматарскі калектыў Беларусі ансамбль песні і музыкі “Крыніца”.

http://vitvesti.by/kultura/brasla-sk-ia-zarn-tcy.html

У канцы **мая** ў Оршы ў рамках федэральнай мэтавай праграмы “Культура Расіі (2012–2018 гг.)” Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі пры падтрымцы аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Аршанскага райвыканкама ў гарадскім цэнтры культуры “Перамога” прайшоў **VI Міжнародны конкурс дзіцяча-юнацкай творчасці “Роза ветров в Беларуси”** і **IV Міжнародны тэатральны конкурс “Дети играют для детей”**.

Витебские вести. – 2016. – 7 июня. – С. 4.

5 чэрвеня ў Гарадку прайшло раённае **свята народнай творчасці, беларускай паэзіі і фальклору, прысвечанае К. Вераніцыну, “Гарадоцкі Парнас-2016”**. Адной з цэнтральных падзей у рамках урачыстых мерапрыемстваў стала акцыя “Чытаем паэму разам”, адбыўся канцэрт з удзелам лепшых творчых калектываў раёна, народнага хору “Світанак” з Шуміліна і вакальнага калектыву “Надзея” з Усвят (Расійская Федэрацыя). Удзельніцы народных аматарскіх аб’яднанняў “Сладушка” Пальмінскага СДК і “Гаспадынька” Кабішчанскага СДК, клубы нацыянальных кухняў Віраўлянскага, Бычыхінскага, Даўгапольскага, Халамерскага, Верамееўскага, Вархоўскага дамоў культуры прадставілі свае адмысловыя стравы. У гэтым годзе ў праграму свята быў уключаны велапрабег “Сцежкамі Тараса”.

http://www.garadvest.by/2016/06/garadocki-parnas/

10–12 чэрвеня ў Паставах прашоў **XIX Міжнародны фестываль народнай музыкі “Звіняць цымбалы і гармонік”**. Сярод шматлікіх мерапрыемстваў у час фестывалю адбыліся: літаратурнае свята “Пакуль пяём на роднай мове мы, жыве зямля бацькоў, жыве Радзіма”, адкрыццё

мастачкі з Якуціі *Феадосіі Івановай* “Іскры легенд” (*бібліятэка імя Е. Лось*).

6 мая Акцыя памяці “Дзень белых жураўлёў” на плошчы Перамогі абласнога цэнтра (*бібліятэкі сістэмы*).

13 мая ў *цэнтральнай бібліятэцы імя М. Горкага* адбыўся міждысцыплінарны лекторый “Як правільна не старэць па-беларуску”, арганізаваны Беларускім рэспубліканскім геранталагічным таварыствам і факультэтам “Здароўезахавання” УА “Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”. Перад прысутнымі выступілі доктар медыцынскіх навук, прафесар *К.І. Прашчаеў* і загадчык кафедры медыцынскай рэабілітацыі, дацэнт *Т.Л. Аленская*.

16 мая ў рамках пасяджэння клуба эстэтычнага выхавання “Вясёлка” адбылася сустрэча “Жыццё ў танцы” з удзельнікамі ўзорнага ансамбля танца “Егоза” ДУ “Цэнтр культуры “Віцебск” і мастацкім кіраўніком калектыву *Л.Я. Самсонавай* (*бібліятэка імя П. Броўкі*).

1 чэрвеня Вечарына, прысвечаная творчасці расійскага барда *А. Суханава* “Не бывает напрасным прекрасное” з удзелам віцебскіх бардаў *У. Сапцына* і *І. Вараной* (*бібліятэка імя Еўфрасінні Полацкай*).

7 чэрвеня Літаратурна-музычная вечарына “Пуцяводная зорка Еўфрасінні” з удзелам барда *П. Захарава*, вакальнай групы “Каўчэг”, ансамбля “Ліра”, паэта *М. Мірановіч*, *айца Тарасія,* паэтэсы *Т. Красновай-Гусачэнка*, *В. Дарошчанкі* (*бібліятэка імя Еўфрасінні Полацкай*).

6–10 чэрвеня Фальклорнае свята “Русалле” з удзелам наведвальнікаў летніх лагераў ДУА “Сярэдняя школа № 28 г. Віцебска”, ДУА “Сярэдняя школа № 12 г. Віцебска”, ДУА “Сярэдняя школа № 11 г. Віцебска” і ДУА “Гімназія № 9 г. Віцебска” (*бібліятэка імя У. Караткевіча*)

26 чэрвеня “Бібліятэчны вернісаж” у рамках творчага праекта “Свята кнігі на вуліцы Пушкіна” (*бібліятэкі сістэмы*).

пагаворым”.

3 чэрвеня Адкрыццё экалагічнага інфармацыйнага рэсурсу – Віцебскага Зялёнага партала vitebsk.greenbelarus.info.

7 чэрвеня Прэзентацыя кнігі міфалагічных апавяданняў кандыдата філалагічных навук, выкладчыка ВДУ імя П.М. Машэрава *Г. Навасельцавай* “І чарам сніцца чалавек”.

9 чэрвеня Вечарына, прысвечаная 30-годдзю стварэння музея “Гісторыя Заронаўскага краю”. Падчас вечарыны прайшла прэзентацыя кнігі кіраўніка музея, краязнаўцы *Л.К. Нікіцінай* “Мой любы край, маё Заронава”.

16 чэрвеня Адкрыццё выставы акварэлі мастака *Ф.Ф. Гумена*.

20 чэрвеня Аўтарскі вечар расійскага вучонага і паэта, прэзідэнта міжнароднага Інстытута кіравання (г. Архангельск, Расійская Федэрацыя), члена Саюза пісьменнікаў Расіі, Саюза пісьменнікаў Беларусі *А.М. Яжова*.

25 чэрвеня Адкрыццё фотавыставы “Звычайныя бацькі” з удзелам бацькоў з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі з групы самадапамогі “ОАЗИС, или Сообщество неидеальных родителей”.

30 чэрвеня Адкрыццё перасоўнай фотавыставы “Мой край не абышла вайна”. Праект рэалізаваны ў рамках Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж абласнымі ўніверсальнымі бібліятэкамі прыгранічных тэрыторый дзяржаў-удзельніц СНД – Віцебскай абласной бібліятэкай імя У.І. Леніна і Смаленскай абласной універсальнай бібліятэкай імя А.Т. Твардоўскага. Экспазіцыя ўключае ўнікальныя фотаздымкі Віцебска і Смаленска даваеннага, ваеннага і пасляваеннага перыядаў з фондаў Смаленскага дзяржаўнага музея-запаведніка, Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, прыватных калекцый, фонду нямецкага горада Хагена.

ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска”

4 мая Прэзентацыя выставы жывапісных работ расійскай

фотавыставы А. Чалея і выставы жывапісу І. Атрахімовіча “Пастаўшчына – мая любоў”, канцэрт-віншаванне да 25-годдзя з дня стварэння заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь фальклорнага ансамбля “Паазер’е” з удзелам замежных творчых калектываў, выступленне Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі М.А. Казінца, прэс-канферэнцыя з кіраўнікамі дэлегацый, членамі аргкамітэта, прадстаўнікамі СМІ, прэзентацыя кнігі “Беларускія народныя музычныя інструменты”, музычна-тэатралізаванае прадстаўленне “Пастаўскі баль”, традыцыйны конкурс калектываў і асобных выканаўцаў на народных інструментах “Хто каго?”, канцэрт эстраднага выканаўцы *Сашы Нэма* і інш.

18–19 чэрвеня 26 калектываў з Расіі, Беларусі, Украіны, Латвіі, Літвы, Румыніі, Малдовы і Польшчы сталі ўдзельнікамі **XXIII Міжнароднага фестывалю песні і музыкі “Дняпроўскія галасы ў Дуброўне”**. У час фестывалю адбыліся наступныя мерапрыемствы: абласны конкурс эстраднай музыкі “BIAton-2016”, акцыя “Свечи памяти”, флэшмоб “За мірнае неба”, гала-канцэрт мастацкіх калектываў і выканаўцаў і Беларусі і замежных краін і інш.

У конкурсе “BIAton-2016” прынялі ўдзел 16 вакальна-інструментальных калектываў і салістаў-інструменталістаў. Пераможцамі сярод ВІА сталі народны гурт “Пані Хіда” і ВІА “Тарас на Парнасе” (г.Орша), народны ВІА “Мара” (Віцебскі раён) і ВІА “Эксперымент-12” (г. п. Шуміліна). Сярод салістаў-інструменталістаў адзначаны *Мікалай Вараб’ёў* (баян) (г. Талочын) і *Аляксандр Букаты* (акардыён) (Докшыцкі раён).

У конкурсе традыцыйнай свістулькі “Салавейка-2016” прынялі ўдзел 18 майстроў-керамістаў вобласці, у тым ліку майстры з Магілёўскай, Мінскай абласцей і з г. Смаленска. Гран-пры конкурсу атрымаў *Вячаслаў Якавенка* (Магілёўская вобласць). Пераможцамі сталі і

Сяргей Масіха (Магілёўская вобласць), *Людміла Чэрвінская* (г. Дуброўна), *Алена Калуханава* (г. Віцебск). У намінацыі “Лепшая дамашняя калекцыя” перамагла *Ірына Шалаева* (г. Гарадок), “Творчы дэбют” – *Алена Батарчук* (г. Міёры), “Аўтарскі падыход у вырабе свістулькі” – *Рыгор Станкевіч* (г. Талочын), “Захаванне народных традыцый” – *Мікалай Стрэльчанка* (Мінская вобласць).

Віцебскі АМЦНТ

Падведзены вынікі **абласнога свята “Тэатральная вясна-2016”**. У конкурсе прынялі ўдзел 20 аматарскіх тэатраў, якія прадставілі творчыя працы ў намінацыях “драматычны спектакль” і “малыя тэатральныя формы”. Па выніках конкурсных праглядаў былі вызначаны пераможцы. Гран-пры атрымаў заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь студэнцкі тэатр “Арт” УА “Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт” (кіраўнік *Ганна Шалепава*) і заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь тэатр “Пілігрым” ДУК “Полацкі гарадскі Палац культуры” (кіраўнік *Вера Кісялёва*). У намінацыі “драматычны спектакль” лепшы – народны тэатр гістарычнага касцюма “Полацкі звяз” ДУК “Полацкі гарадскі Палац культуры” (кіраўнік *Сяргей Пятроў*, рэжысёр-пастаноўшчык *Яўгенія Кавалёва*. Сярод “малых тэатральных форм” перамогу атрымаў народны тэатр Браслаўскага раённага Цэнтра культуры ДУК “Цэнтралізаваная клубная сістэма Браслаўскага раёна” (*кіраўнік Яўген Набееў*).

Віцебскі АМЦНТ

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

1 чэрвеня ў Віцебскай вобласці стартаваў абласны конкурс на лепшы публічны цэнтр прававой інфармацыі.

16–17 чэрвеня ў абласной бібліятэцы адбыўся двухдзённы абласны семінар для бібліёграфаў аддзелаў абслугоўвання і інфармацыі цэнтральных гарадскіх і раённых сетак публічных бібліятэк на тэму “Бібліяграфічныя рэсурсы, прадукты і паслугі: пытанні фарміравання і

выкарыстання”. У ходзе работы семінара абмяркоўваліся пытанні тэорыі і практыкі прымянення стандартызацыі ў галіне бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў, патрабаванні да фарміравання аналітычнага бібліяграфічнага апісання, падрыхтоўкі бібліяграфічных рэсурсаў у электронным фармаце, выдання і афармлення дапаможнікаў. Асаблівая ўвага была нададзена вынікам інфармацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці ў 2015 годзе, а таксама ўдасканаленню бібліяграфічнай складаючай вэб-сайтаў публічных бібліятэк Віцебскай вобласці.

ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна”

12 мая Адкрыццё персанальнай выставы карцін віцебскага мастака *Алега Маханькова* “Палітра жыцця” (у рамках цыкла выстаў твораў людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі).

12 мая Прэзентацыя выставачнага праекта “Урокі патрыятызму. Сувязь пакаленняў” расійскага педагога і паэта, аўтара серыі дзіцячых кніг *Барыса Венядзіктавіча Сакалова* (г. Смаленск).

18 мая ў сектары замежнай літаратуры ў рамках праекта “Библиотека – территория дружбы” прайшоў Lingvaлекторый “Моўная палітра”, прымеркаваны да Сусветнага дня культурнай разнастайнасці ў імя дыялогу і развіцця.

25 мая Свята мастацкай творчасці дзяцей “Да вытокаў народнай культуры” з удзелам тэатральнага калектыву “Вясёлка” ДУДА “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Першамайскага раёна г. Віцебска”, салістаў вакальна-эстраднай студыі “Серпанцін” ДУДА “Віцебскі абласны палац дзяцей і моладзі” і супрацоўнікаў ДУДА “Палац творчасці дзяцей і моладзі г. Віцебска”.

26 мая Адкрыццё выставы графікі студыі творчасці для дарослых “Happy-art” (doodling).

30 мая Творчая сустрэча з акцёрам Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа *Юрасём Цвіркам* “Давайце